Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 3 (512) Субота, 2 лютага 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

*У абстаноўцы вялікай аднадушнасці 29 студзеня ў рэспубліцы пачалося вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР. Рабочыя і калгаснікі, інжынеры і тэхнікі, вучоныя і студэнты называюць сваімі кандыдатамі кіраўнікоў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, наватараў прамысловасці і сельскай гаспадаркі, лепшых прадстаўнікоў інтэлігенцыі.*

## Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР

Прасторную аўдыторыю Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна запоўнілі студэнты, аспіранты, выкладчыкі, супрацоўнікі гэтай буйнейшай ВНУ рэспублікі. Сакратар партыйнага камітэта Т. Я. Дударава аб'яўляе агульны сход калектыву адкрытым. Слова атрымлівае прарэктар універсітэта прафесар В. І. Сцяпанаў.

— Працоўныя нашай рэспублікі, — гаворыць ён, — пасылаюць у органы дзяржаўнай улады лепшых сыноў і дачок. Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Ленінскай выбарчай акрузе горада Мінска Першага сакратара ЦК КПСС, Старшыню Савета Міністраў СССР таварыша Мікіту Сяргеевіча Хрушчова.

Усе ўстаюць і бурнымі працяглымі апладысментамі вітаюць гэту прапанову.

— Усе мы ведаем Мікіту Сяргеевіча як выдатнага партыйнага і дзяржаўнага дзеяча, вернага ленінца, нястомнага змагара за мір і шчасце народаў усёй зямлі, — працягвае прамоўца. — Таварыш Хрушчоў прайшоў вялікі і слаўны шлях ад рабочага да кіраўніка Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы. Ён — дастойны кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета нашай рэспублікі.

Выступае загадчык кафедры БДУ У. М. Сікорскі. Ён гаворыць:

— Я горача падтрымліваю кандыдатуру таварыша Мікіты Сяргеевіча Хрушчова і адначасова прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР кандыдата ў члены Прэзідыума ЦК КПСС, першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі таварыша Кірылу Трафімавіча Мазурава.

Прамоўца расказвае аб жыццёвым шляху таварыша Мазурава, гаворыць аб тым, што ён аддае многа сіл і энергіі для хуткага росту народнай гаспадаркі рэспублікі.

Выступіўшыя на сходзе дэкан факультэта І. М. Ігнаценка і дацэнт С. А. Лысенка таксама горача падтрымалі кандыдатуры таварышаў М. С. Хрушчова і К. Т. Мазурава.

Удзельнікі сходу аднадушна вырашылі вылучыць кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР Першага сакратара ЦК КПСС, Старшыню Савета Міністраў СССР таварыша М. С. Хрушчова і кандыдата ў члены Прэзідыума ЦК КПСС, першага сакратара ЦК КПБ таварыша К. Т. Мазурава і прасіць іх даць згоду балаціравацца па Ленінскай выбарчай акрузе горада Мінска.

## Універсітэт за тыдзень

*27 студзеня в'етнамскія студэнты 1 курса фізічнага факультэта ўрачыста адсвяткавалі нацыянальнае свята — Новы год. На вечары прысутнічалі таксама госці — прадстаўнікі рэктарата, фізічнага факультэта, камітэта камсамола, інтэрнацыянальнага клуба, рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт», кубінскія студэнты. Бурнымі апладысментамі сустрэлі прысутныя навагодняе прывітанне прэзідэнта ДРВ Хо Шы Міна, пісьмо Міністэрства асветы ДРВ, навагоднія прывітанні рэктарата і грамадскіх арганізацый БДУ. Доўга ў той вечар гучалі песні, вершы на в'етнамскай і рускай мовах.*

◆

*29 студзеня закончыла сваю работу арганізаваная Мінскім гарадскім аддзяленнем Беларускага таварыства аховы прыроды выстаўка пеўчых і дэкаратыўных птушак, пародзістых галубоў, акварыумных рыб. У памяшканні біялагічнага факультэта дэманстравалі свае экспанаты аматары — члены гарадскіх секцый птушкаводаў і акварыумістаў. За 11 дзён выстаўку наведалі, па прыблізных падліках, каля 13 тысяч чалавек.*

◆

*У аўторак адбылася чарговая, восьмая лекцыя з цыкла «Майстры замежнага мастацтва». Слухачы пазнаёміліся з творчасцю Веласкеса і яго сучаснікаў.*

## *Састаў акруговых выбарчых камісій па выбарах у Ленінскі раённы Савет дэпутатаў працоўных*

На падставе артыкулаў 45, 46 «Палажэння аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных Беларускай ССР» выканком Ленінскага райсавета дэпутатаў працоўных зацвердзіў акруговыя выбарчыя камісіі ў саставе наступных прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных:

**ВЫБАРЧАЯ АКРУГА № 89**

Старшыня выбарчай камісіі — **Зярніцкі** Марк Саламонавіч — ад камуністычнай арганізацыі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

Намеснік старшыні выбарчай камісіі — **Кічыгіна** Кацярына Васільеўна — ад камуністычнай арганізацыі юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

Сакратар выбарчай камісіі — **Марціновіч** Ізабелла Іванаўна — ад выкладчыкаў юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

**Члены камісіі:**

**Лойка** Алег Антонавіч — ад выкладчыкаў філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

**Балаш** Анатолій Вікенцьевіч — ад прафсаюзнай арганізацыі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

**ВЫБАРЧАЯ АКРУГА № 90**

Старшыня выбарчай камісіі — **Паўленка** Мікалай Андрэевіч — ад камуністычнай арганізацыі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

Намеснік старшыні выбарчай камісіі—**Паіна** Раіса Барысаўна— ад выкладчыкаў філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

Сакратар выбарчай камісіі — **Пятачэнка** Міхаіл Рыгоравіч —ад камуністычнай арганізацыі юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

**Члены камісіі:**

**Папова** Галіна Уладзіміраўна — ад прафсаюзнай арганізацыі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

**Шынгель** Адам Адамавіч — ад студэнтаў юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

**ВЫБАРЧАЯ АКРУГА № 91**

Старшыня выбарчай камісіі — **Бірала** Афанасій Якаўлевіч — ад камуністычнай арганізацыі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

Намеснік старшыні выбарчай камісіі — **Варабей** Георгій Аляксандравіч — ад камуністычнай арганізацыі юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

Сакратар выбарчай камісіі — **Лях** Ніна Яфімаўна — ад прафсаюзнай арганізацыі юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

**Члены камісіі:**

**Шчарбакова** Ірына Міхайлаўна — ад выкладчыкаў філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

**Касоўскі** Барыс Ізраілевіч — ад калектыву работнікаў філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

**ВЫБАРЧАЯ АКРУГА № 92**

Старшыня выбарчай камісіі — **Бякешка** Сяргей Пятровіч — ад камуністычнай арганізацыі юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

Намеснік старшыні выбарчай камісіі — **Дубініна** Лілія Іванаўна — ад камуністычнай арганізацыі юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

Сакратар выбарчай камісіі — **Чыгір** Васілій Фёдаравіч — ад выкладчыкаў юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта

**Члены камісіі:**

**Куляшоў** Фёдар Іванавіч — ад прафсаюзнай арганізацыі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

**Шаўчэнка** Людміла Аляксандраўна — ад выкладчыкаў філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

**ВЫБАРЧАЯ АКРУГА № 93**

Старшыня выбарчай камісіі — **Фактаровіч** Давід Яўсеевіч — ад камуністычнай арганізацыі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

Намеснік старшыні выбарчай камісіі — **Казлова** Ольга Васільеўна — ад камуністычнай арганізацыі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

Сакратар выбарчай камісіі — **Мартынок** Таццяна Ляонцьеўна— ад выкладчыкаў філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

**Члены камісіі:**

**Карніенка** Мікалай Іванавіч — ад камсамольскай арганізацыі юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

**Стыльба** Вікенцій Якаўлевіч — ад камсамольскай арганізацыі юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

**ВЫБАРЧАЯ АКРУГА № 94**

Старшыня выбарчай камісіі — **Лысенка** Соф'я Аляксееўна — ад камуністычнай арганізацыі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

Намеснік старшыні выбарчай камісіі — **Барташ** Чэслаў Канстанцінавіч — ад прафсаюзнай арганізацыі юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

Сакратар выбарчай камісіі — **Карабут** Феадосія Ціханаўна — ад калектыву работнікаў філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

**Члены камісіі:**

**Вадзянава** Алена Рыгораўна — ад камсамольскай арганізацыі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

**Жых** Бернард Станіслававіч — ад камуністычнай арганізацыі юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

## Студэнт-завочнік і кніга

Выключна важнае значэнне мае работа бібліятэкі з завочнікамі. Аснова завочнага навучання — самастойная праца над кнігай. Таму Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР абавязвае бібліятэкі вышэйшых навучальных устаноў забяспечыць студэнтаў-завочнікаў падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі. Не абмяжоўваючыся атрыманнем кніг па запытаннях, студэнтам рэкамендуецца таксама набываць вучэбную літаратуру, тым больш, што многія падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, галоўным чынам, па спецыяльных дысцыплінах спатрэбяцца не толькі для падрыхтоўкі адпаведнага курса, але і пасля заканчэння ВНУ, у практычнай дзейнасці.

Для завочнікаў зручна набываць літаратуру па месцу жыхарства. Ім неабходна інфармацыя аб выхадзе з друку рэкамендаваных дапаможнікаў. Карыстаючыся такой інфармацыяй, завочнікі змогуць своечасова здаваць заказы ў мясцовыя кніжныя магазіны. Аб выхадзе з друку кніг і аб кнігах, якія яшчэ знаходзяцца ў друку, можна даведацца са штотыднёвага бібліяграфічнага бюлетэня «Новые книги», які павінен быць ва ўсіх бібліятэках, а таксама з інфармацый у газетах і часопісах. Многія магазіны «Кніга — поштай» бяруць заказы як ад бібліятэк, так і ад індывідуальных заказчыкаў.

М. ЖЫТКЕВІЧ,
ст. бібліятэкар.

# „КНІГА—ПОШТАЙ“

У многіх буйных гарадах Саюза створаны аддзелы або магазіны «Кніга—поштай». Яны выконваюць заказы накладной платай. Кошт кнігі і яе перасылка аплачваецца заказчыкам пры атрыманні бандэролі. «Кніга — поштай» па патрабаванню чытача высылае лістоўкі і каталогі на наяўную літаратуру.

Прапануем увазе студэнтаў-завочнікаў спіс некаторых адрасоў кніжных магазінаў «Кніга — поштай», у якім указана, на кнігі па якіх раздзелах літаратуры прымае заказ той ці іншы магазін.

**МАСКВА (магазіны Маскнігагандлю)**

№ 2 — вул. Садова-Чорнагразская, 5/9. Сельскагаспадарчая літаратура.

№ 8—вул. Пятроўка, 15. Навукова-тэхнічная літаратура.

№ 46 — вул. Пушкінская, 5/7. Вучэбна-педагагічная літаратура.

№ 64 — вул. Кузнецкі Мост, 18. На замежных мовах і слоўнікі.

№ 89—Астапаўская шаша, пасёлак Тэкстыльшчыкі, корп. 8. Падручнікі для сярэдняй школы, вучэбна-метадычная літаратура, лесатэхнічная і літаратура па кінасправе.

№ 93—вул. 5-я Чаромушкінская, 14. Палітычная, тэхнічная, вучэбна-педагагічная, мастацкая літаратура.

№ 95—вул. Падбельскага, 7/20. Геадэзічная і геалагічная літаратура.

№ 104—вул. Энергетычная, 8, корп. 2. Карты, літаратура па геаграфіі.

№ 106— вул. Кіеўская, 20. Юрыдычная літаратура.

№ 107—Філі, пасёлак Першамайскі, 20. Тэхнічная і тэарэтычная літаратура.

№ 109—вул. Бегавая, 11. Медыцынская і біялагічная літаратура.

**ЛЕНІНГРАД (магазіны Ленгоргандлю)**

«Дом кнігі» — Неўскі праспект, 28. Па ўсіх раздзелах.

№ 1 — Неўскі пр., 16. Літаратура краін народнай дэмакратыі.

№ 3 — Сувораўскі пр., 17. Юрыдычная літаратура.

№ 5 — Ліцейны завулак, 64. Навукова-тэхнічная літаратура.

№ 17 — Сярэдні пр., 45 (Васільеўскі востраў). Па геалогіі, геадэзіі, метэаралогіі і горнай справе.

№ 19 — Маскоўскі пр., 30. Тэхнічная і мастацкая літаратура.

№ 29 — Сярэдні пр., 34. (Васільеўскі востраў). Па сельскай гаспадарцы, медыцыне і транспарту.

№ 42 — праспект Стачак, 17. Па ўсіх раздзелах.

№ 55 — Вялікі праспект, 34. Навукова-тэхнічная літаратура.

**Магазіны (або аддзелы) «Кніга — поштай» у сталіцах саюзных рэспублік**

Мінск, Омскі завулак, 13. Аддзел «Кніга — поштай».
Мінск, Ленінскі пр., 19. Цэнтральны кніжны магазін.
Мінск, Ленінскі, пр., 48. Магазін навуковай і тэхнічнай кнігі.
Кіеў, вул. Крашчатык, 50.
Кішынёў, вул. Леніна, 148.
Тбілісі, вул. Камо, 40.
Баку, Пассаж, Кнігі Азеркітаба.
Рыга, вул. Тэатральная, 11.
Вільнюс, вул. Людас Гірас.
Ташкент, вул. К. Маркса, 31.
Алма-Ата, вул. К. Маркса, 48.
Фрунзе, вул. Савецкая, 72.
Душанбэ, вул. Леніна, 24.
Ераван, вул. Тэр'ян, 91.
Ашхабад, вул. Хівінская, 1.
Талін, вул. Пярну Маантэс, 10.

# Крыху гумару

Некаторыя студэнты хапаюцца за галаву ў час сесіі.

— Няўжо яны толькі цяпер пачалі адчуваць яе на плячах? А з чым жа яны хадзілі ўвесь семестр?

* * *

— Як ты здаў на «добра»?

— Проста. Аддзелаўся агульнымі фразамі.

* * *

**ЕХАУ ПЯШКОМ**

«Усю дарогу я вымушаны быў ехаць пяшком, бо вольных месц у аўтобусе не было».

(З кнігі скаргаў).

# Матрешка на экзамене

Матрёшка шла экзамен Льву
сдавать.
Наряд — в ажуре, губы—красны,
Шпаргалки — есть!
(Такой ли унывать?!)
Вот стол, билеты, и все разны..
Сидит, скучает,
От скуки зевает
Шпаргалки достает,
А нужной—не найдет!
Времени—в обрез, мыслей—
крошка.
Морщится, кривится, трет зрачки...
Лев пробасил: «Пожалте,
Матрёшка...».
Та улыбнулась:
«В другой раз... Забыла... очки».
Матрёшка незнание так обернула:
На очки забытые свернула.

**Георгий ОГИИ,**
**студент 2 курса**
**вечернего отд. журналистики.**

**Па слядах нашых выступленняў**

## „НЕШЧАСЛІВЫ ПАКОЙ“

У нумарах 31 і 35 за 1962 год наша газета расказвала аб антысанітарным стане пакою № 13 у інтэрнаце на вул. Дзімітрава і аб дрэнных паводзінах яго жыхароў. Рашэннем студсавета інтэрната і прафкома юрыдычнага факультэта студэнты Кісялёў і Апалайка выселены з інтэрната, астатнім жыхарам пакою аб'яўлена вымова.

# Практыканты аб сабе

(Пачатак у № 2)

У гэтым нумары студэнтам была прадастаўлена вялікая самастойнасць. У чым жа яна праяўляецца? Пры выпуску ранейшых нумароў газеты «Журналіст» выкладчыкі, якія сочаць за выпускам, не заўсёды давалі студэнтам выказаць сваю, своеасаблівую, асабістую думку. Матэрыялы апрацоўваліся такім чынам, што аўтар часам не мог потым пазнаць сваю работу. На старонках газеты часта можна было сустрэць подпісы не толькі студэнтаў аддзялення журналістыкі, але і выкладчыкаў. Значыць, частка матэрыялаў практычна была падрыхтавана да друку зусім не тымі, хто павінен быў рабіць газету.

Пры падрыхтоўцы нумара, прысвечанага вынікам вытворчай практыкі, такі прынцып быў адхілены. З усіх матэрыялаў і фатаграфій толькі адзін здымак не быў выкананы студэнтамі. Усе матэрыялы былі напісаны і апрацаваны самімі студэнтамі. Стыль аўтарскі ў многім быў захаваны. Такім чынам, пры абмеркаванні газеты пасля выпуску студэнты атрымалі магчымасць разглядаць сапраўдную работу сваіх аднакурснікаў, а не прыведзеныя, як кажуць, у чытабельны від матэрыялы.

Заслугоўваюць увагі апублікаваныя цікавыя лічбы. На 4-й старонцы газета «Журналіст» піша, што за час практыкі студэнты 4 курса надрукавалі 373 матэрыялы. З іх — 11 фельетонаў, 28 нарысаў, 47 замалёвак, 46 рэпартажаў, 107 артыкулаў, 120 інфармацый, 4 рэцэнзіі, адно... апавяданне.

Гэта складае 2000 друкаваных старонак, або 120.000 газетных радкоў. Прыкладна 70 нумароў чатырохпалосных раённых газет можна было б выпусціць з гэтых матэрыялаў.

Кожны з практыкантаў прайшоў і праехаў за час камандзіровак у сярэднім каля 3.500 кіламетраў.

## Фізкультура і СПОРТ

# Баскетбол

*Тры дні ў гасцях у нашых баскетбалістаў былі спартсмены Саратаўскага дзяржуніверсітэта і мужчынская і жаночая каманды Ленінградскага дзяржуніверсітэта.*

*Абедзве сустрэчы жаночых каманд БДУ—ЛДУ выйгралі нашы дзяўчаты, адпаведна 52:26 і 63:47. Абедзве мужчынскія каманды нашага універсітэта выступілі няўдала. Толькі першая зборная БДУ згуляла ў першы дзень унічыю з камандай ЛДУ—53:53 (28:28), на другі дзень БДУ-1 прайграла саратаўскай камандзе з лікам 56:57. БДУ-2 прайграла камандзе Саратаўскага універсітэта з лікам 41:48, а камандзе ЛДУ — 51:62.*

*На трэці дзень госці сустрэліся паміж сабой. Доўгі час перавага была на баку дружна іграўшых саратаўскіх баскетбалістаў. Яны павялі ў ліку, аднак ленінградцы зраўнялі лік у канцы першай паловы ігры. І ўсё ж першая палова закончылася перамогай саратаўцаў — 34:29. Пасля перапынку ленінградцы хутка выраўнялі ігру, выйшлі наперад і закончылі сустрэчу з лікам 67:59 у сваю карысць.*

# ФОТАІЛЮСТРАЦЫЯ Ў ГАЗЕЦЕ

Студэнт 2 курса завочнага аддзялення журналістыкі **Анатолій Дзідзюля** напісаў рэцэнзію на фотаілюстрацыю ў нашай газеце. Сёння мы друкуем яе ў скарачэнні.

Першае, што бачыць чытач, разгарнуўшы раніцай свежы нумар газеты, гэта фотаздымкі. Яшчэ не прачытаны загалоўкі, яшчэ не знойдзен, не выбран артыкул, рэпартаж, карэспандэнцыя, з якіх пачнецца чытанне газеты, а здымкі ўжо ўсе прагледжаны. Міма аднаго погляд прабег раўнадушна, на другім затрымаўся пабольш, а трэці прымусіў пачаць чытанне менавіта з таго артыкула, які ён ілюструе.

Фатаграфія — масавы і найбольш аператыўны від выяўленчага мастацтва, магутны сродак дакументальнай інфармацыі. Яна заваявала ўсеагульнае прызнанне, набыла выключна вялікае значэнне. Мова фатаграфіі інтэрнацыянальная, і ёй не патрэбен пераклад.

Немагчыма прадставіць сабе сучасную газету, часопіс без фотаілюстрацыі, якая адлюстроўвае нашу сучаснасць і жыццё за мяжой. Праўдзівая, мэтанакіраваная, дасканалая ў кампазіцыйных і тэхнічных адносінах фатаграфія — наша вострая ідэйная зброя.

Прагледжваю падшыўку за 1962 год. Аказваецца, не такія ўжо дрэнныя былі справы да тых часоў, пакуль рэдакцыя мела фоталабараторыю, г. зн. да лета мінулага года. Кожны нумар меў не менш 2—3 здымкаў. Гэтая колькасць калі-нікалі даходзіла да 5—6. Хочацца даць аналіз апублікаваных фотаілюстрацый.

Па-першае, тэматыка іх даволі вузкая, у той час як газета прызвана адлюстроўваць ўсе бакі жыцця студэнтаў.

Па-другое, гэта было выклікана тым, што пазаштатных карэспандэнтаў было малавата, нягледзячы на тое, што універсітэт рыхтуе кадры будучых журналістаў.

Найбольш распаўсюджаным у нашай шматтыражнай газеце з'яўляецца партрэт. І ў серыі здымкаў пастаяннымі атрыбутамі партрэтыруемых з'яўляюцца кніга або аловак. А чаму б не зняць студэнта ў часы яго адпачынку— у інтэрнаце, сярод сяброў, на трэніроўцы і г. д.?

Здымка партрэта вельмі складаная: пры гэтым фотарэпарцёр застаецца адзін на адзін з партрэтыруемым, які асабліва востра адчувае накіраваны на яго аб'ектыў. Патрабуецца вельмі шмат часу і цярпення, каб дачакацца, калі чалавек асвоіцца з абстаноўкай і здолее зноў захапіцца сваёй справай. Якія выдатныя магчымасці адкрываюцца перад рэпарцёрам, якія нечаканыя сцэны праходзяць перад аб'ектывам, якія выразныя, яркія моманты жыцця трапляюць на плёнку! Раскрываюцца характары людзей з іх непаўторнай індывідуальнасцю, асаблівасцямі паводзін. Такое не прыдумаеш і не «арганізуеш».

Зместам партрэта заўсёды застаецца псіхалогія асобы. Вобраз павінен захапляць багаццем і прыгажосцю унутранага, духоўнага свету чалавека.

Аднак яшчэ бываюць выпадкі публікацыі фатаграфій розных аўтараў, аднолькавых па задуме. Усім вядома простая ісціна: дзе пачынаецца паўтор, там канчаецца мастацтва. Кожны здымак павінен стаць аб'ектам роздуму, творчых спрэчак, эмацыянальнага ўздзеяння на чытача.

Большасць фотаілюстрацый, апублікаваных у газеце, статычныя, у вочы часта кідаецца інсцэніроўка.

Вялікая сіла фатаграфічнага назірання жыцця. Фотамастацтва зрабіла бачным многае з унутранага свету людзей. Момантавая здымка дапамагла падгледзець тыя фазы душэўнага стану чалавека, якія не даступныя воку мастака. І тут асабліва добра праяўляюць сабе перавагі рэпартажнага прыёму перад так званым пастановачным.

Фотарэпарцёр — гэта не проста ілюстратар газеты. Яго задача не толькі ў тым, каб рабіць газетную старонку жывей, цікавей. Яго задача глыбей і складаней. Яна заключаецца ў тым, каб яго здымкі рабілі тую справу, якую робіць увесь друк: паўсядзённа і актыўна удзельнічаць у барацьбе за камунізм.

Рэпарцёр павінен не проста пратакаліраваць факты ў іх храналагічнай паслядоўнасці, не натуралістычна капіраваць жыццё, а адбіраць з мноства назіранняў галоўнае, найбольш істотнае, характэрнае.

З пачатку бягучага навучальнага года газета фактычна не ілюструецца, таму што цяпер рэдакцыя не мае лабараторыі, гэта значыць не мае галоўнага для ілюстравання газеты. Вядома, што студкоры не маюць магчымасці зрабіць што-небудзь у такіх абставінах. А гаспадарчая частка універсітэта да гэтага часу не выканала рашэння партыйнага камітэта ад 20 верасня аб абсталяванні фоталабараторыі для рэдакцыі шматтыражнай газеты.

Хочацца даць фотааматарам адну параду: здымайце толькі тое, што добра ведаеце, што хвалюе вас, да чаго вы неераўнадушныя. Тады менш будзе няўмелых інсцэніровак, знікне фальш, тады хутчэй прыдзе поспех. Не абдымняйце жыццё, не звадзіце ўсю разнастайнасць спраў і задум маладога пакалення да прывычных стандартаў. Умейце знайсці сваё, непаўторнае, характэрнае.

Рэдактар У. КУЛАЖАНКА.

**Адрас рэдакцыі:**
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 01971. Тыр. 2000. Зак. 400.